# ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

УДК 821.161.3-4

***Бажок І. А. (Гомель, Беларусь)***

## СПЕЦЫФІКА МАСТАЦКІХ СРОДКАЎ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА Ў СУЧАСНЫМ ЭСЭ

*У артыкуле разглядаюцца мастацкія сродкі і аўтарскія стратэгіі, якія выкарыстоўваюць пісьменнікі пры рэпрэзентацыі нацыянальнага ў сучаснай беларускай эсэістыцы. Аб'ектам даследавання сталі паасобныя творы У. Арлова, А. Бахарэвіча, В. Казько, Л. Рублеўскай, В. Акудовіча, А. Бацюкова, Л. Галубовіча, у якіх найбольш выразна вылучаюцца мастацкія сродкі з мэтай звярнуць увагу ўмоўнага рэцыпіента на нацыянальную праблематыку, закранутую аўтарамі ў творах. Сучасныя пісьменнікі выкарыстоўваюць іронію, анафару, сімвалізм, сінтаксічны паралелізм, літаратурны фрэйм, значнай з'яўляецца форма эсэ з лагічнай паслядоўнай структурай, дапоўненай эпіграфамі, вылучэннямі, рытарычнымі пытаннямі, дыялогамі, цытатамі.*

Праблема нацыянальнага – вядучая ў сучаснай беларускай эсэістыцы. Для яе шматбаковага раскрыцця аўтары надаюць значную ўвагу мастацкім сродкам, выкарыстоўваюць пэўныя стратэгіі. Асаблівасць камунікатыўных узаемаадносінаў паміж аўтарам і чытачом у жанры эсэ выяўляецца ў непасрэднай скіраванасці аўтара на выкліканне рэакцыі ўмоўнага чытача. Эсэіст выказвае ўласныя меркаванні наконт мовы, краіны, традыцый, гісторыі, нацыянальнай сімволікі і інш., імкнучыся прадставіць суб'ектыўны пункт погляду. З дапамогай персуазіўнасці, якая з'яўляецца неад'емнай характарыстыкай сучаснага эсэ, аўтар стварае неаспрэчную сістэму доказаў і пераконвае рэцыпіента ў правільнасці ўласнага выказвання. Сінтаксіс і мова сучаснага эсэ даволі ўсталяваныя. З дапамогай размоўнага стылю пісьменнікі імкнуцца ўздзейнічаць на адрасата. Часта пры рэпрэзентацыі нацыянальнага ў сучаснай малафарматнай прозе выкарыстоўваецца сінтаксічны паралелізм, рытарычныя пытанні, клічныя і пытальныя сказы.

Выразным сродкам актывізацыі ўвагі ўмоўнага рэцыпіента пры раскрыцці нацыянальнай ідэі служыць анафара. У эсэ У. Арлова ―Незалежнасць – гэта…‖ аднайменная анафара з'яўляецца тэкстаўтваральным элементам (паўтараецца 18 разоў), яна значна ўзмацняе ідэю твора, спрыяе ўстанаўленню рытму, адпаведнай інтанацыі. Адметнай з'яўляецца так званая ―незапоўненая‖ або ―адкрытая‖ ідэя – абзац, які складаецца толькі з анафары. Такі эсэістычны прыём дае магчымасць для ўсталявання ўмоўнага кантакту паміж аўтарам і чытачом, падштурхоўвае апошняга выказацца, паразважаць.

А. Бахарэвіч у кнізе эсэ ―Каляндар Бахарэвіча‖ пры рэпрэзентацыі нацыянальнага выкарыстоўвае строга прадуманую структуру кожнага твора. Кніга складаецца з 366 эсэ на кожны дзень года пра падзеі, асобы і факты гісторыі. Кожнае эсэ мае ў падзагалоўку каляндарную дату з пэўнай падзеяй. У самім эсэ аўтар прама ці ўскосна выкарыстоўвае гістарычны факт або імя вядомага чалавека ў якасці дапаможных элементаў у стварэнні тэксту. Звычайна эсэ пачынаецца з парадокса ці гістарычнага факта (напрыклад, ―Беларусаў заўсёды цягнула да космасу‖ [1, с. 9]).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адметны мастацкі прыѐм сучасных пісьменнікаў – іронія. У адносінах да творчасці В. Акудовіча – самаіронія. Вострая іронія, праз якую праяўляецца суб‘ектыўная ідэя ―беларускай Беларусі‖ [2, с. 480], – улюбѐны прыѐм У. Арлова.

Эсэіст І. Бабкоў у кнізе ―Каралеўства Беларусь. Вытлумачэнні ру[і]наў‖ асвятляе розныя аспекты ―беларускасці‖, выкарыстоўваючы такія формы аповеду, як дыялогі, цытаты, дзяленні на часткі з назвамі і г. д.

А. Бацюкоў у ―Эсэ пра беларусаў‖ раскрывае ідэю самавызначэння нацыі праз выкарыстанне парадоксаў, з дапамогай якіх аўтар разбурае стэрэатыпнае мысленне. Твор складаецца з некалькіх умоўных частак, першыя з якіх пачынаюцца парадаксальным сцвярджэннем, падмацаваным яскравымі доказамі і прыкладамі, затым ідзе падагульненне, якое адначасова звязвае папярэднія часткі. Так, адзін з парадоксаў разбурае ўсталяваныя погляды на беларусаў як сціплых людзей. Аўтар настойліва і пераканаўча даказвае, што для беларускай нацыі характэрны ―вычварны нарцысізм‖. У выніку развіцця і праяўлення нарцысізму складваецца антыномія ―мы – іншыя‖. З дапамогай такой жорсткай, шокавай тэрапіі эсэіст тонка і лагічна прыводзіць чытача да асэнсавання нацыянальнай праблемы. Другая палова эсэ пабудаваная на параўнаннях, якія дазваляюць аўтару яскрава прадставіць суб‘ектыўны вобраз прадстаўніка нацыі, беларуса. Акрамя адзначаных аўтарскіх стратэгій і мастацкіх сродкаў, А. Бацюкоў у тэксце стварае літаратурны фрэйм, выкарыстоўваючы радок з вядомага анекдота пра беларускі менталітэт. Такі прыѐм робіць фінал эсэ адкрытым для чытацкага асэнсавання. Асабісты погляд аўтара застаецца сфарміраваным і даказаным.  П. Васючэнка ў эсэ ―Беларус вачыма беларуса‖ выкарыстоўвае пытальнаадказавую форму. Аўтар, ад імя якога вядзецца разважанне, тлумачыць сваѐй ―мілай маскоўскай знаѐмай‖ [3, с. 122] сутнасць беларуса, не толькі распавядае, але і знаѐміць з домам, ежай, гісторыяй і інш.

Рэпрэзентацыі нацыянальнай культурнай спадчыны прысвечана кніга эсэ ―Сыс і кулуары‖ Л. Галубовіча. Для прадстаўлення літаратурных каштоўнасцей пісьменнік абраў адметную форму твораў. Кожнае эсэ мае эпіграф, роля якога заключаецца ў стварэнні першаснага мысленчага поля. Другое поле стварае сам аўтар. Атрымліваецца эфект наслойвання ўласна чытацкай думкі і суб‘ектыўнай, цвѐрдай, аўтарскай. Аўтар і чытач уступаюць ва ўмоўны дыялог паміж сабой праз тэкст. Унутраны канфлікт чытача патрабуе дачытаць эсэ да канца і пакідае яго [чытача] сам-насам са сваімі разважаннямі. Такім чынам эсэ выклікае цікавасць у патэнцыйнай аўдыторыі, твор арыентаваны на пэўную крытычную знешнюю рэакцыю. У якасці экспазіцыі літаратурна-крытычных эсэ Л. Галубовіча выступаюць кароткія біяграфічныя звесткі і пералік твораў таго ці іншага пісьменніка. Тлустым шрыфтам вылучаецца назва твора ці кнігі, пра якую ў асноўным пойдзе гаворка ў далейшым. Гэтае вылучанае слова – праекцыя на непасрэдны тэкст эсэ. На праяўленне сімпатый аўтара да канкрэтнага пісьменніка ўказвае графічнае вылучэнне слоў у тэксце (многія эсэісты звяртаюцца да такога прыѐму акцэнтуацыі ўвагі): чым больш слоў вылучана, тым больш ―цѐплым‖ атрымалася эсэ. Вылучаныя словы нясуць вялікую сэнсавую нагрузку, у асноўным гэта філасофскія паняцці, назвы чалавечых каштоўнасцей ці словы, што выражаюць спецыфіку нацыянальнай ідэнтычнасці. Адна з галоўных функцый вылучэнняў – стварэнне цэласнай ідэі кнігі, падкрэсленая ўвага да нацыянальных каштоўнасцей.

В. Казько ў ―Дзікім паляванні ліхалецця‖ нацыянальны характар адлюстроўвае з дапамогай параўнанняў людзей з птушкамі; псіхалагічны стан перадае праз апісанні прыроды. Глыбока аўтар закранае праблему вынішчэння нацыянальных каранѐў, перадаючы яе праз вобраз спаленай зямлі. Абудзіць нацыянальную свядомасць В. Казько

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

імкнецца і праз рытарычныя пытанні: ―І сапраўды, без каранёў, з абылганай гісторыяй, бязмоўныя. Ці ёсць, ці былі мы, ці будзем? [4, с. 178]. У развагах пра нацыянальную міфалагічную культуру аўтар звяртаецца да вобраза ваўкалака, які лічыць роднасным сабе па характары.

Раскрыццё нацыянальнага праз вобразы-сімвалы яскрава прадстаўлена ў прозе Л. Рублеўскай. Агонь, камень, лес, ралля, вада і інш. – словы, з дапамогай якіх пісьменніца сцвярджае каштоўнасць нацыянальнай самабытнасці беларусаў.

Такім чынам, пры рэпрэзентацыі нацыянальнага сучасныя пісьменнікі выкарыстоўваюць наступныя мастацкія сродкі: анафару (У. Арлоў), іронію (В. Акудовіч), сімвалізм (В. Казько, Л. Рублеўская), сінтаксічны паралелізм (У. Арлоў), літаратурны фрэйм (А. Бацюкоў). Важнай у сучаснай малафарматнай прозе з‘яўляецца непасрэдная форма твора: лагічная прадуманая структура з выкарыстаннем дапаможных элементаў (эпіграфаў, вылучэнняў, пытанняў/адказаў, рытарычных пытанняў, дыялогаў, цытат).

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бахарэвіч, А. Каляндар Бахарэвіча / А. Бахарэвіч. – Мінск : Радыё Свабода, 2014. – 464 с.
2. Баршчэўскі, Л. Беларуская літаратура і свет / Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – 596 с.
3. Васючэнка, П. Ад тэксту да хранатопа : артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – 200 с.
4. Казько, В. Дзікае паляванне ліхалецця / В. Казько. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 360 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины